УДК 821.161.3-14."192":711.4

**Наталля Пазняк** (Гомель)

# УРБАНІСТЫЧНАЯ ПАЭЗІЯ 20-Х ГГ. ХХ СТАГОДДЗЯ: БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІЯ ПАРАЛЕЛІ

Па словах Міхася Тычыны, «Пасля лютага і кастрычніка 1917 г. нацыянальны рух, які адухаўляў ад пачатку творчы пошук пісьменнікаў, набыў новае дыханне на Украіне і Беларусі. Многія працэсы адбываліся ці паралельна, ці з пэўным спазненнем у беларусаў, якія, назіраючы за жыццём сваіх суседзяў, амаль беспамылкова маглі ўгадаць сваю бліжэйшую будучыню» [7, с. 244].

Перыяд развіцця беларускай і ўкраінскай літаратуры 20-х гадоў мінулага стагоддзя з'яўляецца адным з самых плённых у плане мадэрнізацыі эстэтычнай формы, наватарскіх пошукаў шляхоў далейшага мастацкага самаўдасканалення.

Сярод навацый гэтага часу не апошняе месца займае актывізацыя звароту пісьменнікаў да апісання гарадской прасторы і гарадскіх топасаў, што ў выніку прывяло да стварэння ў гэты перыяд нацыянальных версій лакальных гарадскіх тэкстаў (кіеўскага, львоўскага, віленскага, полацкага), а ў межах паэтычнай традыцыі да фарміравання асобнай урбаністычнай плыні.

Запознены зварот да ўрбаністычнай праблематыкі ў беларускай паэзіі, у параўнанні з літаратурамі еўрапейскімі, сёння можна тлумачыць featured рознымі фактарамі: паскоранасцю развіцця на пачатку стагоддзя, «недапраяўленасцю» ў сувязі з гэтым некаторых агульнаэстэтычных тэндэнцый, актыўным культываваннем модуса вясковасці ў перыяд фарміравання беларускага нацыянальнага Адраджэння, незавершанасцю фарміравання кола гарадской нацыянальнай інтэлігенцыі.

Супрацьстаянне дзвюх агульнаэстэтычных тэндэнцый — урбаністычнай і вясковай — можна назіраць і ў літаратурным жыцці дваццатых гадоў. Для беларускай літаратуры гэтага часу тэматычна горад звязваецца з гістарычным зломам, прагай пабудовы новага жыцця і адмаўленнем ад папярэдняй традыцыі. Пра «антывясковы» характар развіцця ўкраінскай літаратуры 20-х гадоў гаворыць і Юрый Шэрэх, «…уся літаратура 20-х гадоў… была ў сваёй вялікай частцы антывясковай. Антывясковым быў Сяменка ў сваім апісанні горада, трамваяў, кавярняў і машын; неакласіцызм у палоне гарадскіх белакалонных дзівосаў і ўніверсітэцкай мудрасці; Хвылёвы, закаханы ў вечна цякучыя арабескі неўтаймаванага гарадскога руху (пераклад мой. — Н. П.)» [12, с. 84].

Урбаністычная праблематыка знайшла сваё адлюстраванне ў гэты перыяд і ў межах непасрэдных беларуска-ўкраінскіх кантактных сувязей, у прыватнасці Кузьма Хромчанка адзначае, што ў «…у маладой украінскай паэзіі беларускіх пісьменнікаў асабліва прываблівала павышаная ўвага да тэмы горада, якая ў нашай літаратуры распрацоўвалася тады надзвычай слаба. Мікола Байкоў у рэцэнзіі на зборнік вершаў Уладзіміра Сасюры «Місто» (1923) і першы нумар альманаха «Кварталы» за 1924 г. шырокі зварот украінскіх паэтаў да ўрбаністычнай тэматыкі вытлумачваў бурным развіццём індустрыялізацыі ў рэспубліцы… Вопыт Сасюры ў мастацкім апісанні вытворчай праблематыкі, яго дасягненні і пралікі браліся пад увагу беларускімі паэтамі пры распрацоўцы гэтай, па сутнасці, новай для беларускай літаратуры тэмы ў іх уласнай творчасці» [9, с. 37].

Да тэмы горада ў беларускай паэзіі дваццатых гадоў звяртаюцца аўтары самых розных эстэтычных поглядаў, сярод іх Алесь Дудар, Андрэй Александровіч, Міхась Багун, Анатоль Вольны, Алесь Звонак, Валерый Маракоў, Юрка Лявонны, Міхась Лужанін, Сяргей Дарожны, Віктар Казлоўскі, Міхась Хведаравіч, Янка Відук, Язэп Пушча, Тодар Кляшторны, Паўлюк Шукайла і інш.

Найбольшай мастацкай інтэнсіўнасцю ў галіне новай урбаністычнай вобразнасці ў перыяд дваццатых гадоў вылучаюцца творчыя эксперыменты самага шматколькаснага беларускага літаратурна-мастацкага аб'яднання «Маладняк».

Наватарскімі для беларускай паэзіі гэтага часу сталі зборнікі паэзіі Алеся Дудара і Андрэя Александровіча, Анатоля Вольнага, дзе аўтары перш за ўсё «…імкнуцца перадаць водгулле

© Пазняк Н., 2014

барыкад, рытмічны гул машын, станкоў, фабрычных гудкоў, настрой людзей гарадскіх вуліц» [2, с. 31], сцвердзіць пафас адмаўлення старога даіндустрыяльнага свету.

Так, у паэтычным цыкле Дудара «Горад», другім урбаністычным цыкле ў гісторыі беларускай літаратуры пасля «Места» Максіма Багдановіча, паступова выкрышталізоўваецца іншае, не варожае і адмоўнае, як у вершах Шарля Бадлера і Эміля Верхарна, а хутчэй рамантычна-ўзнёслае ўспрыманне лірычным героем гарадскога ладу жыцця. На думку Ірыны Багдановіч, згаданы паэтычны цыкл, нягледзячы на наватарства для беларускай літаратуры, адлюстраваў «…традыцыйнае для паэтыкі 20-х гадоў апяванне завадскіх гудкоў і фабрычных труб, сталёвага грукату варштатаў і будаўнічых рыштаванняў — усіх гэтых індустрыяльных вобразаў, якія ўспрымаліся як фетышы сацыялістычнага будаўніцтва, як пераможныя крокі рэвалюцыі ў заўтра» [1, с. 282].

Па сутнасці, «даніну літаратурнай модзе» па паэтызацыі гарадскіх рэалій у гэты час так ці інакш сплочваюць амаль усе значныя постаці эпохі.

Невыпадкова Алесь Звонак, дыскутуючы пра мэтазгоднасць празмернага захаплення ўрбаністычнай праблематыкай, у адным з вершаў пад назвай «Наконт гораду», з іроніяй адзначаў «Горад! / Пратры ліхтаровыя вочы! / Вочы ў сто дваццаць вольт. / Я сягоньня нястрымана хочу / Разгадаць сон таемны твой. / О міганьне электрычных зорак! / Нязьлічоныя іх агні… / Адчуваю, што стану скора / Самы ўрбаніськейшы урбаніст. / Мне больш уласьцівы настрой лірычны / І спляценьне цьвітучых надзей, / Чым пяяньне пра дым фабрычны, / Які — я ня знаю адкуль ідзе…» [5, с. 45].

Прысутнасць урбаністычных матываў ва ўкраінскай літаратуры гэтага перыяду можна заўважыць ў творах неакласікаў, дзе горад успрымаецца найперш як культурна-гістарычная і філасофская дамінанта, галоўная каардыната цывілізацыйнага развіцця грамадства.

Самай высокай ступені тэматычнай праяўленасці ўрбаністыка ва ўкраінскай літаратуры дваццатых гадоў дасягнула ў творчасці Міхайля Сяменкі, «…горад стаў цэнтрам усіх вобразаў і самога ўнутранага жыцця пісьменніка (пераклад мой. — Н. П.)» [8, с. 10], засведчыў з’яўленне не толькі новых словаформаў, але і новай авангарднай «кверафутурыстычнай» мовы мастацтва.

Футурыстычная ўстаноўка на пабудову новага свету, ваяўнічая апантанасць барацьбой з папярэдняй мастацкай традыцыяй праявіла сябе і ў беларускай літаратуры.

Упершыню ў гісторыі беларускай літаратуры свядома футурыстамі сябе абвясціла «Беларуская Літаратурна-Мастацкая камуна». У склад яе ў розны час уваходзяць Уладзімір Прыбыткоўскі, Мікола Бацюшкаў, Янка Відук (Скрыган), Віктар Казлоўскі, Міхась Калачынскі і Мікола Хведаравіч, ідэйным натхняльнікам становіцца Паўлюк Шукайла. Галоўным друкаваным органам Камуны стаў літаратурна-мастацкі часопіс «Росквіт», прычым аб’яднанне адным з асноўных творчых арыенціраў абвяшчала «…суполку ўкраінскіх футурыстаў «Новая генерацыя» і аднайменны часопіс» [4, с. 9–10].

Ужо на на старонках першага нумара беларускага выдання ў раздзеле «На Украіне» аглядальнік адзнаначаў, што «вышла з друку першая штомесячная часопісь левага фронту мастацтва «Новая Генэрацыя». У часопісі зьмешчаны вершы, апавяданьні, тэарэтычныя і крытычныя артыкулы і малюнкі новых сучасных мастацкіх плыняў у Нямеччыне»[10, с. 181].

Па словах Ганны Білай, украінскі ж часопіс галоўнай тэмай абраў «маляванне дынамікі сацыялістычнага будаўніцтва, тытанічнага змагагання чалавека са стыхіяй (у тым ліку ўрбаністычнай, як, напрыклад, завод, чыгунка, аэра)… увогуле матыў тэхнічнага прагрэсу (пераклад мой. — Н. П.)» [3, с. 179].

Падобныя эстэтычныя тэндэнцыі могуць быць заўважаны ў вершах Янкі Відука (Скрыгана), Віктара Казлоўскага, Міколы Хведаровіча.

Напрыклад, падарожжа лірычнага героя Хведаровіча па горадзе амаль заўсёды ператвараецца ў апісанне новай сацыялістычнай рэчаіснасці: / Іду, / Перазвону трамвайных званкоў / Фізматаўцу нат ня зьлічыць. / Кепак, / Пастэркаў, / Капялюшоў, / Манто, / Паліто — / Не пералічыць… / Вуліца, / Трамваі, / Крыклівы аўто, / Снапамі праменьні / З ліхтаровых арбіт… / І чую, / Заводы вядуць пераклік / [11, с. 179], паэтызацыя ідэальнага горада адбываецца ў вершах Казлоўскага /Урываецца / сонца / праз / шыбы вакон / І мяне / з-за стала / выганяе ў горад / -Трэба падслухаць / машын акорд / Каб заспакоіць / лірычны голад. / Карпусы

гарадоў!.. / Карпусы гарадоў!.. / Вы ўрасьлі / ў карпусы / маіх / вершаў. / Кожная літара / Кожны радок — / гэта музыка / цэглы / і вапны/ [6, с. 7].

Такім чынам, фарміраванне ўрбаністычнай плыні паэзіі ў беларускай і ўкраінскай літаратуры дваццатых гадоў было абумоўлена супольнымі фактамі існавання ў новых гістарычных умовах, пазначана непасрэднымі літаратурнымі кантактамі, аднак, калі ва ўкраінскай літаратуры паэтызацыя горада набыла размах, сцвердзілася як новая мастацкая вобразнасць, напрыклад, у творчасці Міхайля Сяменкі, у беларускай літаратуры ўрбаністыя матывы праявіліся ў якасці з'явы перыфірыйнай, што часам набывае адценні неразумення і іранічнага непрымання.

**Літаратура:**


1. Багдановіч І. Э. Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / Ірына Эдуардаўна Багдановіч. — Мн. : Бел. навука, 2001. — 387 с.
2. Беларускія пісьменнікі і літаратурны працэс 20-30-х гадоў / АН БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мн. : Навука і тэхніка, 1985. — 328 с.
3. Біла А. Український літературний авангард: пошуки, стильові напрямки. Монографія. Видання друге, доповнене і перероблене / Біла Анна. — К. : Смолоскип, 2006. — 464 с.
4. Жыбуль В. В. Ідэйна-мастацкія пошукі ў беларускай паэзіі 20-х — пачатку 30-х гадоў ХХ стагоддзя : аўтарэф. дыс. на атрыманне навук. ступені канд. філалаг. Навук : спец. 10.01.01 — беларуская літаратура / Жыбуль В. В. — Мн., 2003. — 21 с.
5. Звонак А. Буры ў граніце / Алесь Звонак. — Мн. : Белдзяржвыд БССР, 1929. — 110 с.
6. Казлоўскі В. Музыка працы / Віктар Казлоўскі. — Мн. : Дзярж. Выд. Беларусі, 1932. — 64 с.
7. Тычына М. А. Драма адраджэння / Міхась Аляксандравіч Тычына // Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей: культурна-гістарычны і літаратурны аспекты праблемы / Нац. акад. навук Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. — Мн. : Бел. навука, 2002. — 363 с. — С. 220–289.
8. Семенко М. Поезії / [редкол. О.Є. Засенко та ін. ; вступ слово М.П. Бажана ; упоряд. та стаття Є. Г. Адельгейма] / Семенко Михайль. — К. : Рад. письменник, 1985. — 311 с. — (Б-ка поета).
9. Хромчанка К. Р. Скрыжаванні шляхоў адраджэння. Беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі 20-30-х гадоў ХХ стагоддзя / Хромчанка К. Р. — Мн. : БДУ, 2009. — 158 с.
10. Хроніка. На Украіне // Росквіт. — 1927. — № 1. — С. 149.
11. Хведаровіч М. Тэмпы-кантрасты / Хведаровіч М. — Мн. : БДВ, 1931. — 112 с.
12. Шерех Ю. Людина і люди / Шерех. Ю. Пороги і запоріжжя. Література. Мистецтво. Ідеології : у 3 т. — Харків : Фоліо, 1998. — Т. 1. — С. 81–91.



**Urban Poetry of the 1920's: Belarusian and Ukranian Parallels**

The article focuses on the image of a city in the poetry of the 1920's. Special attention is given to Belarusian and Ukrainian literature contacts, which are described in a diachronical and comparative aspect. The author of the article has studied urban topos and motives in the literature of the neighboring countries.


*УДК 821.161.2.09"19"+791.43*

***Ярина Цимбал** (Київ)*

# ФУТУРИСТИ НА КІНОФАБРИЦІ: ЛІТЕРАТУРА І КІНО В «НОВІЙ ГЕНЕРАЦІЇ»

Спроби на практиці синтезувати різні види мистецтва неминуче випливали з теоретичного підґрунтя українського панфутуризму. Згідно з теорією культів Михайля Семенка, яку він сформулював ще 1924 року, мистецтво — це культ у його термінології, тобто система культури, а література, живопис, кіно, музика, архітектура, скульптура — підкульти, або підсистеми мистецтва [8, с. 304–305]. Усі культи підлягають діалектичному закону народження і відмирання, або ж конструкції і деструкції. Диференціація в межах підсистеми, як-от поява

© Цимбал Я., 2014